УДК 94(476) + 323.15 (476)

*І.А. ПУШКІН*

# АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ БССР У 1920-я гг.

*У артыкуле на падставе дакументальнага матэрыяла з архіваў Беларусі, Літоўскай Рэспублікі і Расійскай Федэрацыі аналізуецца фарміраванне нацыянальнай палітыкі БССР у 1920-я гг. Сфармуляваны яе асаблівасці і асноўныя накірункі дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання па рэгуляванні працэсаў грамадскага і культурнага развіцця нацыянальных супольнасцей. Ахарактэрызаваны этапы нацыянальнай палітыкі савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Уводзіны**

Актуальнасць артыкула абумоўлена нацыянальнай і рэлігійнай разнастайнасцю Беларусі. Без аналізу палітыка-прававых асноў і кірункаў удзелу нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурным жыцці Беларусі, адносін афіцыйных уладаў да іх немагчыма выпрацаваць глыбока прадуманую, адпаведную інтарэсам краіны, сучасную нацыянальна-дзяржаўную палітыку. У гэтым сэнсе зварот да вопыту 1920-х гг., калі адбываўся працэс фарміравання і стварэння органаў кіравання нацыянальна-дзяржаўнай палітыкай ва ўмовах станаўлення савецкай дзяржаўнасці Беларусі, з'яўляецца крайне неабходным.

Нацыянальную палітыку камуністычнай партыі бальшавікоў (КП(б)) у міжваенны час разглядалі ў сваіх публікацыях Н. Васілеўская [1], А. Глагоўская [2], М. Касцюк [3], А. Лейзераў [4], У. Навіцкі [5], І. Пушкін [6], І. Раманава [7], М. Тэры [8]. У той жа час асаблівасці яе фарміравання і дзейнасць спецыяльных органаў кіравання, якія займаліся рэалізацыяй асноўных кірункаў нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі на практыцы, даследаваны не ў поўным аб'ёме. У артыкуле выкарыстаны матэрыялы з дзяржаўных архіваў Беларусі, Літоўскай Рэспублікі і Расійскай Федэрацыі.

**Асноўная частка**

Нацыянальная палітыка КП(б) была сфармулявана на яе X (1921 г.) і XII (1923 г.) з'ездах. Прадугледжваліся наступныя мерапрыемствы ў галіне нацыянальных адносін: ліквідацыя эканамічнай адсталасці раней прыгнечаных народаў, паскоранае развіццё іх культуры і мовы, стварэнне на нацыянальных мовах кніжных выдавецтваў, сродкаў масавай інфармацыі, школ, хат-чытален, вылучэнне на адказную работу прадстаўнікоў мясцовага карэннага насельніцтва, перавод на нацыянальную мову справаводства і інш.

Можна вылучыць тры перыяды ў міжваеннай палітыцы савецкага кіраўніцтва ў дачыненні да нацыянальных меншасцей [9, с. 217].

1) 1920–1928 гг. – перыяд рашучага пашырэння правоў усіх без выключэння нацыянальных супольнасцей, найбольш спрыяльны для развіцця нацыянальных меншасцей у Беларусі. Галоўнай небяспекаю ў гэты час лічыўся велікарускі шавінізм, і з ім камуністычная партыя вяла рашучую барацьбу.

2) 1929–1935 гг. – перыяд значнага абмежавання правоў меншасцей, калі кіраўніцтва УКП(б) адмовілася ад супрацоўніцтва з прадстаўнікамі меншасцей, якія не з'яўляліся прыхільнікамі ідэй класавай барацьбы і пралетарскай ідэалогіі. Наступіў час барацьбы з "мясцовым нацыяналізмам".

3) 1936–1939 гг. – перыяд панавання цэнтрысцкіх тэндэнцый у нацыянальнай палітыцы. Гэта – перыяд узмацнення рэпрэсій у дачыненні да ўсіх сацыяльных пластоў і груп нацыянальных меншасцей.

У 1920-я гг. канцэпцыю шматнацыянальнай і цэнтралізаванай дзяржавы КП(б) рэалізоўвала не з дапамогаю прымусовага захавання цэласнасці былой імперыі, а праз усталяванне фармальна незалежнай улады мясцовых камуністаў у нацыянальных раёнах на прынцыпах захавання ўсёй паўнаты кантролю над сітуацыяй у руках савецкай улады. На гэта паўплывала і тое, што паводле Рыжскай мірнай дамовы шэраг народнасцей (беларусы, румыны, украінцы, фіны і інш.) апынуліся па розныя бакі дзяржаўнай мяжы СССР. Камуністычнае кіраўніцтва разлічвала, што добрае стаўленне да той часткі народаў, якія апынуліся ў Савецкім Саюзе, прыцягне другую іх частку ў Польшчы, Фінляндыі, Румыніі да барацьбы гэтых народаў за ўз'яднанне з СССР. Увага надавалася развіццю культур не толькі прадстаўнікоў тытульных нацый рэспублік саюза, але і нацыяналь-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных меншасцей. Для іх таксама прадугледжвалася шырокая нацыянальная і культурная аўтаномія пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. У параўнанні з палітыкай, якую праводзілі ўлады Расійскай імперыі да 1917 г., дзеянні бальшавікоў насілі прагрэсіўны характар [8].

Раскрываючы асаблівасці нацыянальнай палітыкі ў Беларусі, варта адзначыць некалькі важных момантаў.

Пэўная частка жыхароў, пераважна інтэлігенцыі, брала ўдзел у стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. Значна больш насельніцтва выступала за Савецкую Беларусь (БССР). Прычым у праграмных дакументах абедзвюх рэспублік гарантавалася роўнасць усіх народаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі [10, арк. 1; 11, арк. 34].

На палітыку дзяржаўнага кіраўніцтва ў адносінах да нацыянальных меншасцей паўплывалі тэрытарыяльныя змяненні межаў БССР. Мяняліся адносіны як у цэлым, так і па асобных рэгіёнах. На вернутых у склад БССР усходнебеларускіх землях да 1924 і 1926 гг. дзейнічала заканадаўства РСФСР, у тым ліку ў адносінах да нацменшасцей, якімі лічыліся беларусы, а рускія – карэнным насельніцтвам. Затым усё стала наадварот, і ўлады БССР сталі адносіць рускіх да меншасці.

З першых гадоў савецкай улады частка прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей была выключана з грамадска-палітычнага жыцця. Яна была пазбаўлена выбарчых ці іншых праў з-за свайго сацыяльнага паходжання (былыя гандляры, святары і г. д.). Але аказвала значны ўплыў на насельніцтва праз асабісты аўтарытэт.

Найбольш удалай у сферы нацыянальнага будаўніцтва ў БССР стала палітыка беларусізацыі, якая паспрыяла культурнаму росквіту ўсіх нацыянальных супольнасцей. Ад палітыкі беларусізацыі найбольшую карысць атрымалі яўрэі, латышы, літоўцы, палякі і нават рускія.

Кіруючыя колы БССР, якія дзейнічалі ў напрамку выканання пастаноў і рэзалюцый цэнтральных органаў улады, з першых дзён у адпаведных пастановах з'ездаў КП(б)Б і саветаў, рашэннях выканаўчых органаў улады рэспублікі дэкларавалі роўнасць моў і магчымасцей для прадстаўнікоў усіх нацыянальных супольнасцей. Аб чым сведчаць матэрыялы лютаўскай сесіі ЦВК саветаў Беларусі (1920 г.), 2-га Усебеларускага з'езда Саветаў (1920 г.), змест "Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь" (31.07.1920 г.). Вялікую ролю ў правядзенні нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі БССР адыгралі рашэнні VII з'езда КП(б)Б (1923 г.) [12, арк. 16; 13, арк. 14–15; 14, с. 204–205, 208; 15, с. 159].

Напачатку ў БССР, па прыкладу РСФСР, быў утвораны Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей, але ён праіснаваў менш за месяц і рашэннем ЦБ КП(б)Б быў ліквідаваны. Далей у Савецкай Беларусі арганізоўвалі і кіравалі працай сярод меншасцей нацыянальныя бюро пры КП(б)Б, Нацыянальная камісія пры Прэзідыуме ЦВК БССР, а з 1934 г. Аддзел нацыянальнасцей.

22–25.11.1920 г. адбыўся III з'езд КП(б)Б. На ім было вырашана, каб у дзяржаўныя ўстановы і органы ўлады рэспублікі ўваходзілі прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць на яе тэрыторыі. Пачалася праца па арганізацыі органаў кіравання справамі нацыянальных меншасцей. З'езд выказаўся за стварэнне нацыянальных бюро пры ЦБ, а пазней ЦК КП(б)Б. Ва ўсходняй частцы Беларусі, якая на той час уваходзіла ў склад РСФСР, існавалі падобныя структуры як на рэспубліканскім (на прэзідыуме Белбюро ЦК РКП(б) 19.03.1920 г. быў зацверджаны склад польскага і яўрэйскага бюро), так і рэгіянальных узроўнях РКП(б) [16, арк. 38–41; 17, арк. 3–3адв., 4–5, 10–14]. На бюро ЦК КП(б)Б

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15.12.1925 г. былі зацверджаны адзіныя назвы для мясцовых секцый: "еўбюро", "латбюро", "польбюро", якія ўтвараліся пры акруговых камітэтах КП(б)Б. Яны праіснавалі да пачатку 1930 г.

Яўрэйскае бюро ЦК КП(б)Б існавала са снежня 1920 г. З 1922 г. называлася Галоўнае бюро яўрэйскай секцыі. Кіравала дзейнасцю яўрэйскіх секцый пры мясцовых арганізацыях КП(б)Б. Узначальваў бюро А. Бейлін. Польскае бюро пры ЦК КП(б)Б дзейнічала з 6.01.1922 г. да 1929 г. Сакратарамі польбюро ў розны час былі Цесьляк, В. Шаля, В. Внароўскі і інш. Латышскае бюро ЦК КП(б)Б працавала ў 2-й палове 1920-х гг. У розны час ў кіраўніцтва ўваходзілі А. Думс, Клявін, Кулен. З 1927 г. латышскае бюро ЦК КП(б)Б складалася з 11 членаў і 5 кандыдатаў. Літоўскае бюро ЦК КП(б)Б узнікла ў 2-й палове 1920-х гг. З 1926 г. сакратар А. Недварас (псеўданім Ёнас Бучукас). У 1929 г. у Літоўскае бюро ЦК КП(б)Б уваходзіў С. Матулайціс [18, арк. 1–37; 19, арк. 38].

Нацыянальныя бюро пры ЦК КП(б)Б выконвалі наступныя асноўныя задачы: вядзенне агітацыі і прапаганды сярод рабочых і беднаты адпаведнай нацыянальнасці, палітычнае выхаванне членаў партыі з ліку нацыянальнай меншасці, барацьба супраць уплыву буржуазіі і дробнабуржуазных груп на працоўныя масы і інш. А таксама кіравалі дзейнасцю латышскіх, літоўскіх, польскіх, яўрэйскіх секцый пры мясцовых арганізацыях КП(б)Б. Польбюро намагалася ўзаконіць палітазаванае атаясамліванне часткі беларускага этнасу каталіцкага веравызнання з польскай нацыянальнай прыналежнасцю. Нацыянальныя бюро, сярод іншага, кантралявалі і дзейнасць Народнага камісарыята асветы ў сферы дзейнасці нацыянальных школ, падрыхтоўкі настаўнікаў і г.д. Выдавалі свае перыядычныя выданні: на польскай мове – газеты "Młot" ("Молат") і "Orka" ("Ворыва"), на літоўскай "Raudonasis Artojas" ("Чырвоны араты"). У верасні – кастрычніку 1927 г. латышскае бюро выдала газету-аднадзёнку, прысвечаную 10-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Іншыя спробы бюро арганізаваць выданне латышскай перыёдыкі ў БССР поспеху не мелі.

У 1920-я гг. польскія бюро існавалі пры Бабруйскім, Барысаўскім, Віцебскім, Калінінскім і Мінскім, латышскія пры Полацкім, Віцебскім, Барысаўскім, Магілёўскім і Бабруйскім, літоўскія пры Віцебскім і Аршанскім акруговых камітэтах КП(б)Б. Сярод гарадской і вясковай моладзі працавалі латышскае і польскае бюро пры ЦК ЛКСМБ, а таксама мясцовыя польбюро ЛКСМБ у некаторых акругах. У Віцебскай акрузе меўся штатны работнік па працы сярод латышоў у АК ЛКСМБ [20, арк. 1–6; 21, арк. 42–44; 22, арк. 50–72; 23, арк. 38].

Нацыянальныя бюро правялі беспартыйныя канферэнцыі польскіх працоўных і губернскі з'езд польскіх работнікаў асветы ў Віцебску (1920, 1921 гг.), Полацку (1921 г.), агульны сход настаўнікаў польскіх школ у Магілёве (1921 г.). Сумесна з Нацкамісіяй ЦВК БССР: 1-ы Усебеларускі з'езд палякаў-сялян БССР (1926 г.), 2-і Усебеларускі з'езд працоўных палякаў (1929 г.), выбары дэлегатаў на Сусветны з'езд палякаў (1929 г.), 1-ы Усебеларускі з'езд сялян-латышоў (1926 г.), 1-ы Усебеларускі з'езд сялян-літоўцаў (1928 г.). У канцы 1929 г. пад кіраўніцтвам латышскага бюро адбыліся 3-я Усебеларуская нарада латышоў-партработнікаў і 2-і Усебеларускі з'езд рабочых і сялян латышоў [24, арк. 258; 25, арк. 17–18 адв.; 26, арк. 1–55; 27, арк. 59].

У 1920-я гг. на тэрыторыі БССР ствараліся нацыянальныя мясцовыя саветы, дзейнічалі на мовах нацыянальных меншасцей школы і аддзяленні пры сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установах, культурна-асветныя ўстановы, друкаваліся перыядычныя выданні і літаратура [6]. Варта адзначыць, што ў другой палове 1920-х гг. арганізацыйная праца савецкага (АВК, РВК) і партыйна-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га (АК, РК КП(б)Б) апаратаў у асноўным вялася па-беларуску і на мовах нацыянальных меншасцей у месцах іх кампактнага пражывання. Адукацыя і асвета на нацыянальных мовах з'яўлялася сродкам саветызацыі нацыянальных меншасцей.

11.04.1927 г. VIII Усебеларускі з'езд саветаў прыняў новую Канстытуцыю БССР, у якой дэкларавалася забеспячэнне свабоднага эканамічнага і культурнага развіцця, павышэнне дабрабыту працоўных і раўнапраўе ўсіх нацыянальнасцей, стварэнне нацыянальных саветаў, была замацавана роўнасць беларускай, рускай, яўрэйскай (ідыш) і польскай моў і г. д. Аднак у канцы 1920-х гг. пачынаецца працэс паступовай ліквідацыі нацыянальна-моўнай разнастайнасці, асіміляцыі і акультурацыі прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей. Стаўка рабілася на інтэрнацыяналізм шляхам адміністратыўных мер. У 1930-я гг. адбыўся паварот у нацыянальнай палітыцы краіны, змест якой патрабуе асобнага даследавання.

## Заключэнне

Аналіз асаблівасцей фарміравання нацыянальнай палітыкі БССР у 1920-я гг. і асноўных кірункаў дзейнасці органаў партыйна-дзяржаўнай улады дазваляе канстатаваць, што змест, формы і накіраванасць працы ў асяроддзі нацыянальных меншасцей з самага пачатку браліся пад строгі кантроль КП(б). Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР фарміравалася не ў Беларусі, за выключэннем асобных, самастойных дзеянняў у сярэдзіне 1920-х гг. У яе кірунках прасочваюцца тэндэнцыі на прадастаўленне нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацыянальным меншасцям. У той жа час нацыянальна-дзяржаўная палітыка насіла ў большасці несістэмны характар, нягледзячы на пэўныя поспехі ў забеспячэнні насельніцтва ўстановамі, якія працавалі на роднай мове. Улады не ставілі мэтай адраджэнне ці замацаванне традыцыйных укладаў нацыянальных меншасцей. Асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з'яўлялася іх саветызацыя. Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР выкарыстоўвала патэнцыял нацыянальных меншасцей толькі для дасягнення канчатковай мэты – пабудовы камуністычнага грамадства.

У 1920-я гг. былі створаны і дзейнічалі спецыяльныя органы (нацыянальных бюро) па кантролю і кіраванню працэсамі этна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей. У выніку быў назапашаны станоўчы вопыт дзяржаўнага кіравання ў сферы міжнацыянальных адносін і грамадскай дзейнасці супольнасцей. Дзякуючы чаму, прадстаўнікі нацыянальных меншасцей БССР праявілі сваю актыўнасць ва ўсіх сферах тагачаснай палітычнай сістэмы. Значная частка з іх актыўна ўдзельнічала ў справе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Васілеўская, Н.У.*** Захады савецкай улады па забяспячэнні культурных патрэбаў этнічных меншасцяў БССР у першай палове 1920-х гадоў / Н.У. Васілеўская // Беларусь-Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003г.) / рэдкал. У.І. Навіцкі (гал. рэд.), М.П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск : Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 231–234.
2. ***Głogowska, Helena.*** Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki / Helena Głogowska. – Białystok, 1996. – 238 s.
3. ***Касцюк, М.П.*** Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. – Мінск: ВП Экаперспектыва, 2000. – 308 с.
4. ***Лейзеров, А.*** Национальная политика в Беларуси в первые годы советской власти (1920–1939) / А. Лейзеров // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 1. – Мінск : Водолей, 2002. – С. 104–109.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. ***Навіцкі, У.І.*** Савецкая палітыка ў адносінах да этнічных супольнасцей Беларусі / У.І. Навіцкі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск : Дэполіс, 2001. – С. 15–24.
6. ***Пушкін, І.*** Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.) : манаграфія / І. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2004. – 168 с.
7. ***Романова, И.*** Политика большевиков в отношении национальных меньшинств в Беларуси в межвоенный период / И. Романова // Ethnic Culture: Traditions and Innovations. – Kaunas, 2004. – С. 340–347.
8. ***Терри, Мартин.*** Империя "положительной деятельности". Нации и национализм в СССР, 1923–1939 / Мартин Терри. – М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), Фонд "Президентский центр Б.Н. Ельцина", 2011. – 666 с.
9. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П.Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: А.А.Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус.навука, 2008. – 615 с.
10. Даклад міністра па справах нацыянальных меншасцей БНР Жыблоўскага // Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў г. Вільнюс (LCVA). – Фонд 582. – Воп. 1. – Спр. 26.
11. Хроніка для газет // LCVA. – Фонд 582. – Воп. 1. – Спр. 1.
12. Матэрыялы сесіі ЦВК. 1920 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 10.
13. Матэрыялы II Усебеларускага з'езда саветаў // НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 10.
14. Матэрыялы Пленума ЦК КП(б)Б // НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 1. – Спр. 2479.
15. ***Пурышева, Н.М.*** "Фактор БНР" в культурной политике БССР (начало 1920-х гг.) / Н.М. Пурышева // Романовские чтения – 5 : сб. трудов Международной науч. конференции. – Могилев : УО "МГУ им. А. А. Кулешова", 2009. – С. 158–159.
16. Пратакол пасяджэння літоўскай секцыі пры Гомельскім губкоме РКП(б). 16.08.1921 г. // Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). – Ф. 17. – Воп. 63. – Спр. 30.
17. Справаздача польбюро пры ЦК КП(б)Б па паветах за 1921 г. // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 253.
18. Пратаколы пасяджэнняў польбюро пры ЦК КП(б)Б за 1928 г. // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 380.
19. Справаздача // НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 1. – Спр. 3637.
20. Анкеты аб працы польскіх секцый пры мясцовых партыйных арганізацыях БССР // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 255.
21. Пратакол пасяджэння літоўскай секцыі пры Мінскім губкоме КП(б)Б // РДАСПГ. – Фонд 17. – Воп. 63. – Спр. 30.
22. Справаздачы аб працы польскіх школ, хат-чытален і г. д. у БССР // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 253.
23. Інфармацыя аб працы сярод латышскага насельніцтва // НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 12. – Спр. 36.
24. Пратаколы I беспартыйнай канферэнцыі польскіх працоўных, з'езда польскіх работнікаў асветы // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 258.
25. Пратакол агульнага сходу настаўнікаў польскіх школ у Магілёве // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 260.
26. Пратаколы I-га Усебеларускага з'езда сялян палякаў у Мінску 28.02.–3.03.1926 г. // РДАСПГ. – Фонд 63. – Воп. 1. – Спр. 381.
27. Справаздачы аб працы Латбюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 1. – Спр. 2987.

Паступіў у рэдакцыю 07.05.2014 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова